Funded by
the European Union

Беларуская адукацыя
на шляху зменаў

# АДУКАЦЫЙНЫЯ ІНІЦЫЯТЫВЫ БЕЛАРУСІ: МАПА ЎЗАЕМАДЗЕЯННЯЎ

Вильнюс
2021

Беларусское Образование Перемен
EUROBELARUS International Consortium
Офис по образованию Для новой Беларуси

*РЭЗЮМЭ*


Падзеі канца 2020 — пачатку 2021 года паказалі, што розныя працоўныя і сацыяльныя групы ў Беларусі дэманструюць розную ступень кансалідаванасці дзеянняў і ўзаемнага даверу. Напрыклад, настаўніцкія і выкладчыцкія суполкі ў пэўнай ступені аб'ядналіся і рэалізоўвалі асобныя ініцыятывы, але не сталі рухавікамі змен.  Дадзенае даследванне накіраване на высвятленне прычын гэтай сітуацыі праз

- апісанне асаблівасці ўзаемадзеяння беларускіх адукацыйных ініцыятыў, візуалізаваць мапу ўзаемасувязей;
- ацэнку узаемазвязанасці ініцыятыў, шчыльнасці сувязей;
- вызначэнне рэальных лідараў сярод адукацыйных арганізацый;
- выяўленне незанятых нішаў і кірункаў развіцця адукацыі, у якіх ёсць патрэба з боку адукацыйных ініцыятыў.

У драмках даследавання былі апытаны 64 прадстаўнікі розных адукацыйных ініцыятыў і арганізацый, паводле гэтых дадзеных створана мапа іх узаемадзеяння. Агулам у разгляданне патрапілі 256 адукацыйных арганізацый Беларусі. Метадам сеткавага аналізу ўзаемасувязей (social network analysis) прааналізаваны і візуалізаваны сувязі паміж найбольш актыўнымі арганізацыямі. Гэта дазволіла вызначыць лідараў сярод адукацыйных арганізацый, ацаніць ступень звязанасці, разгледзець сувязі паміж адукацыйнымі ініцыятывамі з розных рэгіёнаў і кірункамі дзейнасці. Акрамя гэтага, прадстаўнікі ініцыятыў выказалі свае меркаванні наконт таго, чага не хапае для далейшага развіцця беларускай адукацыі і ініцыятыў у прыватнасці.

Вынікі даследвання дазволілі зрабіць наступныя высновы

- ***Хаця ініцыятыў даволі мала, большасць з іх мае ўзаемныя праекты з іншымі.*** Усе рэспандэнты пазначалі, што маюць працоўныя сувязі з іншымі адукацыйнымі ініцыятывамі і праектамі. Мапа моцных узаемных сувязей, на якой прадстаўлены 45 рэспандэнтаў з 64 (70%) пацвярджае, што гэтыя сувязі сапраўды існуюць, бо адзначаюцца абодвума бакамі. У склад ізалятаў трапляюць перадусім тыя арганізацыі, што займаюцца адукацыйнымі праектамі хутчэй ускосна.
- ***Устойлівых груп ініцыятыў даволі мала.*** Хаця двухбаковых сувязей адносна шмат, ініцыятывы не маюць тэндэнцыі аб'ядноўвацца ў больш буйныя працоўныя групы, дзе кожны ўзаемадзейнічае з кожным. Устойлівых трыяд ва ўсёй сетцы было толькі 5 (аб'яднаныя ў чатыры суполкі). Толькі 13 арганізацый (20%) маюць сімеліянскія (трыядныя) сувязі. Не было ніводнай супольнасці ініцыятыў, у якой сувязі ўсіх з усімі мелі б чатыры ці больш ініцыятывы.
- ***Узаемадзянні існуюць, але ім бракуе каманднасці, аб'яднанасці.*** Трыяды і больш буйныя структуры ўзаемных сувязей лічацца падмуркам для фарміравання сацыяльнага капіталу (устойлівай сеткі сувязей, заснаваных на даверы і дасягненні агульных мэт). У эканоміцы сацыяльны капітал сярод насельніцтва наўпрост асацыюецца з павелічэннем магчымасцей эканамічнага росту. У кіраўніцтве адукацыяй (напрыклад, у сярэдняй адукацыі) высокі сацыяльны капітал на-

стаўнікаў звязаны з павышэннем якасці адукацыі. Можна высунуць гіпотэзу, што такія ж тэндэнцыі будуць праўдзівымі і для адукацыйных арганізацый і ініцыятыў. Чым больш высокі сацыяльны капітал уласцівы гэтай сістэме, тым большага росту эфектыўнасці можна чакаць у дзейнасці ўсёй адукацыйнай сістэмы.

- ***Найбольш развіты кірунак — метадычная падтрымка настаўнікаў.*** Гэта можна патлумачыць тым, што мэтавая аўдыторыя даволі шырокая. Да таго ж, частка настаўнікаў мае запыт на веды, узаемадзеянні. Пры тым ускосныя дадзеныя аб азначаных ініцыятывах сведчаць пра тое, што пакуль што гэта даволі невялікая колькасць настаўнікаў (напрыклад, колькасць падпісчыкаў у сацсетках, абвестках звычайна не дасягае 2 тыс. чалавек пры агульнай колькасці настаўнікаў каля 100 тыс.). Іншымі словамі, настаўніцкія ініцыятывы найбольш прыметныя сярод іншых, але і яны ў межах усяго настаўніцкага поля закранаюць не больш 2-3% «настаўнікаў-пасіянарыяў».

- ***Хаця ёсць разгалінаваная сетка, у кожнай катэгорыі вельмі мала арганізацый.*** Пэўныя ініцыятывы адзначалі ў інтэрв'ю: «Нам хацелася б, каб не толькі мы займаліся гэтым пытаннем, а каб былі і іншыя ініцыятывы ў гэтай сферы». Умоўная «канкурэнцыя ідэй» існуе толькі ў кірунку сярэдняй адукацыі (напрыклад, метадычная падтрымка настаўнікаў), часткова — у асветніцкіх праектах (пераважна ў галіне культуры). Аднак нават гэтыя сферы не заняты цалкам, пра што сведчыць, напрыклад, невысокі ахоп настаўнікаў альтэрнатыўнымі метадычнымі ініцыятывамі (не больш за 3% педагогаў). Таксама распаўсюджаны адказ, што культурніцкіх ініцыятыў усё яшчэ бракуе, як і не хапае асветы ў нішах, дзе намінальна ёсць 1-2 арганізацыі (палітычныя правы, грамадзянскасць, прававая пісьменнасць, роўнасць і г.д.).

- ***Пэўныя кірункі адукацыі амаль не прадстаўленыя.*** На мапе няма ніводнай ініцыятывы, якая б працавала, напрыклад, у галіне дашкольнай адукацыі. Пры гэтым сярод актараў амаль не выказвалася такой праблемы (менавіта пра дашкольную адукацыю). У той жа час міжнародныя даследаванні падкрэсліваюць значную ролю ранняй адукацыі для паспяховасці ў далейшым навучанні. Вельмі сціпла прадстаўлена вышэйшая адукацыя (толькі некалькі студэнцкіх ініцыятыў і аналітычны цэнтр). Часткова гэта можа тлумачыцца асаблівасцямі метадалогіі даследавання, калі не ўсе магчымыя арганізацыі трапляюць на мапу. З іншага боку, гэта можа сведчыць аб ізаляванасці адукатараў, паглыбленасці выключна ў свой кантэкст без бачання шырокай перспектывы, стратэгіі.

- ***Большасць арганізацый і ініцыятыў канцэнтруюцца ў Мінску.*** Абласных ініцыятыў на парадак меней, раённыя можна лічыць выключэннем. Выснова пра тое, што ў абласных і раённых гарадах значна менш ініцыятыў, не новая: пра гэта сведчылі папярэднія даследаванні. Аднак праблемай падаецца тое, што, нягледзячы на невялікую колькасць арганізацый, часта яны застаюцца ізаляванымі. Можна вызначыць актыўную працоўную групу ініцыятыў у Гродна, аднак астатнім рэгіянальным ініцыятывам уласціва ізаляванасць. Часткова гэта даецца абгрунтаваць тым, што ў пэўнай мясцовасці можа не быць арганізацый з падобнай адукацыйнай павесткай, а сувязі з іншымі рэгіёнамі не наладжаныя. Трэба яшчэ раз адзначыць абмежаванне даследавання з той перспектывы, што ізаляваныя рэгіянальныя ініцыятывы могуць заставацца па-за межамі аналізу.

- ***Адукатары даволі адзінадушна вызначаюць апісаныя вышэй пункты ў якасці праблем.*** З аднаго боку, было шмат адказаў пра тое, што адукацыйных ініцыятыў зараз даволі мала (то-бок гэты ландшафт актараў можа быць больш шчыльны), асабліва па-за межамі сталіцы. З іншага боку, была азначана патрэба ў фасілітацыі ўзаемадзеянняў, пабудове камунікацыі паміж рознымі ініцыятывамі. Важны кірунак — развіццё інфраструктуры для «выгадоўвання» і «адаптацыі» адукацыйных ініцыятыў: ад акселератараў, хабаў, кансультантаў да даследчых цэнтраў і thinktank-аў. Ініцыятывы развіваюцца стыхійна. Вельмі рэдка абумоўліваюць існаванне адзін аднога. Таму што няма актуальнага прававога поля, запатрабаванасці з боку грамадства, ангажаванасці педагогаў і прадстаўнікоў іншых сфер дзейнасці. Проста кажучы, няма ўсведамлення, што так можна, і гатоўнасці ўзяць на сябе частку адказнасці за адукацыйны ландшафт.

- ***Першапачаткова неадукацыйныя арганізацыі займаюць значную прастору сярод адукацыйных ініцыятыў.*** У склад лідараў на мапе ўзаемадзеяння трапілі шмат арганізацый, для якіх адукацыйная дзейнасць не з’яўляецца асноўнай. Напрыклад, гэта праваабарончыя, экалагічныя, сацыяльна арыентаваныя супольнасці, якія, акрамя асноўнай дзейнасці, ладзяць асветніцкія праекты.

- ***Структура ўзаемадзеянняў даволі дынамічная.*** Хаця падмурак узаемадзеянняў складае суполка НДА, якая існуе не менш за дзесяцігоддзе, новыя арганізацыі могуць даволі часта займаць ролю цэнтральных фігур у сеткавых узаемадзеяннях. Пра гэта сведчыць тое, што ў ТОП-10 уплывовых ініцыятыў чатыры — адносна нядаўнія. Напрыклад, можна заўважыць рост ролі прыватных школ, якія актыўна ўзаемадзейнічаюць паміж сабой і пры гэтым застаюцца ўпісанымі ў метадычную супольнасць арганізацый рознага тыпу.

- ***Па годзе заснавання можна вылучыць тры хвалі ініцыятыў:*** самыя сталыя, якія існуюць з 1990-х (іх не так шмат і гэта звычайна НДА з некалькімі сферамі дзейнасці), яшчэ адна хваля ініцыятыў узнікла ў перыяд адноснай лібералізацыі ў 2011 і крыху пазней (іх можна зазначыць як «аснову»), а таксама новыя ініцыятывы (што маюць менш за 3-5 гадоў). Новыя ініцыятывы паводзяць сябе па-рознаму: адна частка ўліваецца ў агульную супольнасць, другая ўтварае невялікія супольнасці ў сваёй сферы дзейнасці, якія звязаны з агульнай групай ускосна.

- ***Прадстаўнікі ініцыятыў праяўляюць высокі ўзровень асэнсаванасці праблем у адукацыі:*** паводле адказаў было вызначана 12 кірункаў развіцця адукацыйных праектаў. Амаль кожны адказ адзначаўся ў розных формах не менш за тры разы. Высокі запыт можна заўважыць у кірунку адукацыйных даследаванняў, рэфлексіі і аналітыкі. Яшчэ адзін буйны кірунак удасканаленняў — праца над зместам адукацыйных праектаў: больш сучасных, «балючых» для грамадства, арыентаваных на спецыфічныя групы, міждысцыплінарных адукацыйных, асветніцкіх праектаў.

# ЗМЕСТ

Уводзіны...6

Метадалогія...8

Аналіз дадзеных...11

Узаемадзеянні адукацыйных ініцыятыў...13

Партрэт арганізацый...13

Мапы ўзаемадзеянняў...14

Сувязі інцыятыў...18

Характарыстыкі сеткі ўзаемадзеянняў...29

Патрэбы адукатараў...35

Высновы...37

# УВОДЗІНЫ

Падзеі канца 2020 — пачатку 2021 года паказалі, што розныя працоўныя і сацыяльныя групы ў Беларусі дэманструюць розную ступень кансалідаванасці дзеяння ў і ўзаемнага даверу. Напрыклад, настаўніцкія і выкладчыцкія суполкі ў пэўнай ступені аб'ядналіся і рэалізоўвалі асобныя ініцыятывы, але не сталі рухавікамі змен.

У гэтай сувязі нарадзілася гіпотэза, што недахоп сацыяльнага капіталу[1] (то-бок устойлівых сувязей, заснаваных на ўзаемадзеянні і даверу) характэрны і для адукацыйных ініцыятыў Беларусі. Пад ініцыятывамі мы разумеем зарэгістраваныя і незарэгістраваныя, дзяржаўныя і недзяржаўныя арганізацыі ці супольнасці, якія рэалізуюць адукацыйныя, асветніцкія ці інфраструктурныя праекты (па-за межамі выключна камерцыйнай дзейнасці ці прамых абавязкаў дзяржаўных структур).

Мэты даследавання:

- апісаць асаблівасці ўзаемадзеяння беларускіх адукацыйных ініцыятыў, візуалізаваць мапу ўзаемасувязей;
- ацаніць узаемазвязанасць ініцыятыў, шчыльнасць сувязей;
- вызначыць рэальных лідараў сярод адукацыйных арганізацый;
- знайсці незанятыя нішы і кірункі развіцця адукацыі, у якіх ёсць патрэба з боку адукацыйных ініцыятыў.

Трэба адзначыць, што першапачаткова даследаванне не планавалася як ананімнае, то-бок мы планавалі апублікаваць асноўных лідараў на мапе адукацыйных ініцыятыў. Аднак палітычныя абставіны і клопат пра рэспандэнтаў вымусілі нас аперыраваць выключна закрытымі дадзенымі.

*Абмежаванні і далейшыя даследаванні.* Гэтае даследаванне дае агульнае ўяўленне пра ландшафт беларускіх адукацыйных ініцыятыў. Тым не менш, яно мае свае абмежаванні.

Адно з іх звязанае з метадалогіяй. Збор дадзеных метадам снежнага камяка часам пакідае па-за ўвагай ізаляваныя ў межах сеткі ініцыятывы (ці нават групы ініцыятыў), якія аднак могуць быць уплывовымі ў сваіх рэгіёнах ці сферах. Можна

1 Сацыяльны капітал разумееца ў значэнні «здольнасці групы да ўзаемадзеяння з мэтай рашэння агульных праблем», Hargreaves, A., & Fullan, M. (2013). The power of professional capital. The Learning Professional, 34(3), 36.

прапанаваць гіпотэзу, што частка ініцыятыў у абласных і раённых гарадах ці іншых населеных пунктах засталася неўзгаданай. Гэтае абмежаванне часткова здымаецца, калі зрабіць дадатковы пошук рэспандэнтаў у іншых гарадах.

Другое важнае абмежаванне — у першай хвалі інтэрв'ю прынялі ўдзел не ўсе арганізацыі. На малюнку з агульнымі сувязямі (мал. 8) можна ўбачыць 5-7 арганізацый, якія знаходзяцца ў цэнтры ўзаемадзеянняў, але не трапілі ў разгляданне. Часцей за ўсё, адмова ад інтэрв'ю тлумачыцца сітуацыяй патэнцыйнай небяспекі ў дадзены перыяд. Калі разглядаць статыстыку ўваходных моцных сувязей і пакідаць рэспандэнтаў, якія трапляюць пад даследчае азначэнне «адукацыйнай ініцыятывы», то паўстае неабходнасць апытаць яшчэ каля 25-30 арганізацый. Такім чынам, паводле грубай ацэнкі, дадзеная мапа пакрывае каля 65-70% усіх ініцыятыў і ўзаемадзеянняў паміж імі.

Некаторыя ініцыятывы са спіса з'яўляюцца хутчэй асобнымі праектамі адукацыйных арганізацый, але супольнасцю часта ўспрымаюцца як асобныя. У некалькіх выпадках праекты пэўнай арганізацыі былі больш вядомыя, чым сама арганізацыя. Такім чынам, фіксуюцца не столькі арганізацыйныя структуры, колькі супольнасці. У гэтым сэнсе праектныя супольнасці могуць быць менш устойлівымі. Важна дадаць, што ў пэўных ініцыятывах супадае склад лідараў: напрыклад, калі адна каманда ладзіць некалькі праектаў.

Акрамя таго, дадзенае даследаванне з'яўляецца першай фіксацыяй узаемадзеянняў беларускіх ініцыятыў, таму паказчыкі цяжка ацэньваць і няма магчымасці паглядзець на дынаміку.

Тым не менш, атрыманыя дадзеныя могуць быць падставай для прыняцця рашэнняў у кіраванні адукацыяй. Далейшае пашырэнне колькасці рэспандэнтаў і правядзенне паўторных замераў можа стаць асновай для больш грунтоўнага аналізу.

# МЕТАДАЛОГІЯ

Спіс рэспандэнтаў вызначаўся метадам «снежнага камяка»[2], калі першы(ая) рэспандэнт(ка) абіраў(ла)ся выпадкова сярод адукацыйных арганізацый. Гэты(ая) рэспандэнт(ка) азначаў(ла) спіс ініцыятыў і арганізацый, з якімі ўзаемадзейнічае яго(яе) арганізацыя. Потым праводзілася апытанне прадстаўнікоў тых ініцыятыў, якія былі ўзгаданы — і гэтак далей. Апытанне праводзілася ў выглядзе структураваных інтэрв'ю (асабіста ці анлайн) у перыяд з лістапада 2020 па чэрвень 2021.

Інтерв'ю не праводзіліся з тымі арганізацыямі, якія не падпадалі пад даследчае азначэнне, што мы лічым «адукацыйный ініцыятывай».

Адукацыйная ініцыятыва — гэта ўстойлівае аб'яднанне людзей, якія рэалізуюць некамерцыйныя адукацыйныя праекты, якія выходзяць па-за межы абавязкаў дзяржаўных структур.

Такім чынам, дзейнічалі наступныя «фільтры»:

- Гэта дзяржаўныя арганізацыі, для якіх такі від дзейснасці з'яўляецца абавязковым, пры гэтым праца арганізацыі не выходзіць за межы абавязкаў (напрыклад, большая частка інстытутаў развіцця адукацыі. Аднак калі іншыя ініцыятывы адзначалі, што маюць нефармальныя праекты з гэтымі арганізацыямі, то яны траплялі ў спіс рэспандэнтаў).
- Гэта недзяржаўныя арганізацыі, якія прапануюць платныя адукацыйныя паслугі, пры гэтым іх дзейнасць не выходзіць за гэтыя межы (напрыклад, прыватныя школы ці адукацыйныя цэнтры, якія рэалізуюць выключна камерцыйную дзейнасць. Аднак калі арганізацыя такога тыпу праяўляла праактыўнасць і ладзіла праекты, то таксама трапляла ў спіс рэспандэнтаў).

Хаця мы не апытвалі прадстаўнікоў адукацыйных арганізацый, якія не адпавядалі азначаным характарыстыкам, яны тым не менш траплялі ў больш шырокае разгляданне. У апытанні прынялі ўдзел 64 прадстаўнікі адукацыйных ініцыятыў Беларусі. Усяго рэспандэнты ўзгадалі 256 арганізацый, звязаных з адукацыяй.

У разгляданне патрапілі розныя тыпы арганізацый і ініцыятыў: напрыклад, гэта былі як арганізацыі, якія займаюцца выключна адукацыйнымі праектамі, так і іншыя грамадзянскія арганізацыі, якія вядуць адукацыйную ці асветніцкую дзейнасць. Таксама ў разгляданне патрапілі тры дзяржаўныя ініцыятывы, якія

2 Апісанне метаду: Biernacki, P., & Waldorf, D. (1981). Snowball sampling: Problems and techniques of chain referral sampling. Sociological methods & research, 10(2), 141-163.

мелі працоўныя адносіны з НДА і ў сваёй працы выходзілі па-за межы прамых абавязкаў.

Большасць з тых арганізацый, якія не патрапілі ў апытанне, адносяцца да тых ініцыятыў, што трапляюць пад абмежаванні даследавання. Аднак былі выпадкі адмоў ад даследавання праз сітуацыю небяспекі.

Плюсамі такога метаду даследавання можна лічыць наступнае:

- аналіз узаемасувязей адукацыйных арганізацый дазваляе вызначыць лідараў, найбольш уплывовыя арганізацыі, што немагчыма пры звычайным складанні спіса ініцыятыў;
- можна ацаніць сферу цалкам: тыпы і інтэнсіўнасць узаемадзеянняў, асаблівасці сувязей.

У якасці асноўнага абмежавання можна адзначыць, што ізаляваныя суполкі (напрыклад, рэгіянальныя, тэматычныя) могуць не трапляць у разгляданне, бо так званы «снежны камяк» да іх не даходзіць. Акрамя таго, рэспандэнт ад арганізацыі можа не ведаць усіх узаемасувязей (асабліва гэта датычыцца буйных ініцыятыў).

Рэспандэнтам прапанавалася адказаць на пытанні трох тыпаў:

- *Агульныя характарыстыкі арганізацыі:* месца знаходжання, геаграфія працы, год заснавання, сфера дзейнасці, прыватная гэта ці дзяржаўная арганізацыя, наяўнасць афіцыйнай рэгістрацыі, колькасць супрацоўнікаў і валанцёраў.
- *Сеткавыя ўзаемасувязі.* Рэспандэнты адказвалі, якія іншыя адукацыйныя ініцыятывы ці арганізацыі яны ведаюць, з кім і ў якім фармаце ўзаемадзейнічаюць.

Для кожнай арганізацыі рэспандэнты пазначалі адзін з 5 тыпаў узаемадзеяння:

| | |
|---|---|
| 1 | Ведаю гэтую ініцыятыву/арганізацыю, але ніяк не ўзаемадзейнічаем |
| 2 | Ведаю асобных людзей з гэтай ініцыятывы/арганізацыі, але інстытуцыянальна не ўзаемадзейнічаем |
| 3 | Удзельнічаем у агульных праектах, але неўзаемазвязана (напрыклад, як госці, партнёры мерапрыемства) |
| 4 | Ёсць вопыт рэалізацыі сумесных праектаў (як партнёры, сувыканаўцы, замоўцы і г.д.) |
| 5 | Выпрацоўваем агульную павестку, якую рэалізоўваем праз агульныя скаардынаваныя дзеянні, якія б былі немагчымыя паасобку |

Таксама рэспандэнты называлі не болей за трох чалавек, якіх яны лічаць лідарамі азначаных ініцыятыў. Гэта дазваляла вызначаць наступных рэспандэнтаў ад арганізацый (па колькасці ўзгадванняў).

- *Патрэбы і запыты.* Пасля апісання сеткавых узаемадзеянняў рэспандэнтам прапанавалася вызначыць, якіх адукацыйных ініцыятыў ці арганізацый ім не хапае, якія яны маюць партрэбы.

## АНАЛІЗ ДАДЗЕНЫХ

Для разглядання ўзаемадзеянняў выкарыстоўваўся метад сеткавага аналізу (social network analysis). Спачатку ўсе дадзеныя пра ўзаемадзеянні заносіліся ў табліцу, дзе ў радках былі азначаны рэспандэнты, а ў слупках — іх выбары. Ніжэй паказаны прыклад збору дадзеных (напрыклад, ініцыятыва 1 ведае 2 і супрацоўнічае з 3, прадстаўнік ініцыятывы 2 ведае кагосьці з 3 і г.д.):

**Табліца 1.** Прыклад дадзеных аб сеткавых узаемадзеяннях

| | Ініцыятыва 1 | Ініцыятыва 2 | Ініцыятыва 3 | Ініцыятыва 4 | Ініцыятыва 5 | Ініцыятыва 6 |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Ініцыятыва 1 | | 1 | 4 | | | |
| Ініцыятыва 2 | | | 2 | | | |
| Ініцыятыва 3 | 4 | | | | | |
| Ініцыятыва 4 | | | | | 3 | |
| Ініцыятыва 5 | | | | 3 | | |
| Ініцыятыва 6 | | | | | | |

Потым сувязі візуалізаваліся на мапе ініцыятыў, візуалізацыя табліцы 1 прадстаўлена ніжэй:




**Мал. 1.** Візуалізацыя дадзенных аб сеткавых узаемадзеяннях[3]

3 Тут і далей візуалізацыі і разлікі зроблены ў праграме: Borgatti, S.P., Everett, M.G. and Freeman, L.C. 2002. Ucinet 6 for Windows: Software for Social Network Analysis. Harvard, MA: Analytic Technologies.

Кожная ініцыятыва на мапе была азначана кропкай (у дадзеным выпадку — сінім квадратам), а стрэлкамі пазначаліся сувязі паміж імі. У сеткавым аналізе ўжываюцца таксама словы «актар», «вузел», гэтыя словы можна лічыць сінонімамі «ініцыятывы».

Усе сувязі ў дадзенай сетцы маюць накіраванасць: частка сувязей — узаемныя (напрыклад, 4 і 5 адначасова пазначылі, што ўзаемадзейнічаюць), частка — неўзаемныя, аднабаковыя (напрыклад, 1 ведае 2, але 2 не ведае 1; 2 ведае кагосьці з 3, але рэспандэнт 3 не ўзгадаў 2). Ініцыятыва 6 не мае сувязей, такія актары сеткі называюцца «ізалятамі».

Акрамя візуалізацыі дадзеных, быў праведзены аналіз асноўных характарыстык сеткі ўзаемадзеянняў беларускіх адукацыйных ініцыятыў. Гэта дазваляе атрымаць адказы на наступныя пытанні: Наколькі сетка сувязей цэнтралізавана ці дэцэнтралізавана? Наколькі сувязі ўзаемныя? Ці ёсць устойлівыя групы? Наколькі лёгка інфармацыя можа перадавацца ў межах дадзенай канфігурацыі ўзаемадзеянняў?

# УЗАЕМАДЗЕЯННІ АДУКАЦЫЙНЫХ ІНІЦЫЯТЫЎ

## Партрэт арганізацый

Было праведзена 64 інтэрв'ю з прадстаўнікамі адукацыйных арганізацый. У разгляданне трапілі 61 недзяржаўная і 3 дзяржаўныя ініцыятывы. 44 з із знаходзяцца ў Мінску, 7 — у абласных гарадах, 1 — у раённым цэнтры, 12 адносяцца да іншых катэгорый (напрыклад, працуюць анлайн ці маюць некалькі прадстаўніцтваў па Беларусі).

Сярэдняя колькасць працоўных ставак — 6. У большасці арганізацый стаўкі дробныя, то-бок шмат хто працуе на 0,25 ці 0,5 стаўкі. Прыблізна чвэрць арганізацый не мае працоўных ставак і будуе дзейнасць цалкам праз валанцёрства ці па разавых дамовах падраду. Максімальны памер — 40 ставак, але звычайна гэта тычыцца арганізацый, у якіх ініцыятыўная дзейнасць у адукацыі не з'яўляецца асноўнай і ў гэтым напрамку занятыя некалькі чалавек з арганізацыі. Калі не разглядаць такія арганізацыі, то ў «сярэдняй беларускай адукацыйнай ініцыятыве» ў штаце працуе 3-4 чалавекі.

Пры гэтым валанцёраў і часовых супрацоўнікаў у некалькі разоў болей (іх колькасць можа дасягаць некалькі сотняў чалавек).

## Мапы ўзаемадзеянняў

***Мапа ўзаемадзеяння асноўных рэспандэнтаў*** (n=64) прадстаўлена ніжэй (мал. 2). На ёй усе сувязі, якія былі азначаны ініцыятывамі (ад «проста ведаю» да «выпрацоўваем агульную павестку»). Стрэлачкамі пазначаны кірункі сувязей, даўжыня рысы ролі не грае.




**Мал. 2.** Мапа ўсіх узаемадзеянняў асноўнай групы рэспандэнтаў (n=64)

Гэтая схема дае толькі вельмі агульныя ўяўленні пра ландшафт адукацыйных ініцыятыў. Можна убачыць некалькі цэнтральных фігур (напрыклад, 5, 21, 26), пры гэтым большасць іншых ініцыятыў (на перыферыі сеткі) мае адносна невысокую колькасць сувязей (3-5).

Узаемадзеянні — гэта двухбаковы працэс. Таму больш інфарматыўнай будзе схема, на якой азначаны толькі ўзаемныя сувязі, калі рэспандэнты абедзвюх ініцыятыў пазначаюць у якасці партнёраў адзін аднаго. У сеткавым аналізе двухбаковыя (узаемныя) сувязі разглядаюцца як больш устойлівыя. Яны абазначаюць, што з большай верагоднасцю абодва актары маюць цікавасць адзін да аднаго і, такім чынам, патэнцыйна могуць праяўляць ініцыятыву да ўзаемадзеянняў. Таксама двухбаковыя сувязі асацыююцца з большым узроўнем даверу, што важна для развіцця сацыяльнага капіталу.




**Мал. 3.** Мапа ўзаемных сувязей асноўнай групы рэспандэнтаў (n=64)

На графе узаемадзеянняў відаць значна меней сувязей, да таго ж малюнак выглядае больш цэнтралізаваным, бо некалькі ініцыятыўў відавочна з'яўляюцца буйнейшымі цэнтрамі ўзаемадзеянняў (напрыклад, 5, 12, 25, 26). Без іх (нават калі гэта ўсяго чатыры ініцыятывы) агульная сетка сувязей амаль распадаецца.

Злева на малюнку можна ўбачыць 11 ініцыятыў, якія не маюць аніводнай узаемнай сувязі, то-бок з'яўляюцца ізалятамі. Цікава, што ў гэтую групу патрапілі перадусім тыя арганізацыі, для якіх адукацыйная дзейнасць з'яўляецца дадатковым, а не асноўным напрамкам працы. Пры гэтым 4 ізаляваныя ініцыятывы з 11 — гэта рэгіянальныя супольнасці, для якіх адукацыйныя ці асветніцкія праекты — асноўная дзейнасць. Хаця ў рэгіёнах значна менш арганізацый, чым у Мінску, можна было б чакаць, што ўнутры сваёй тэрыторыі ў іх будуць больш цесныя сувязі, аднак адбываецца наадварот. Пры меншай колькасці арганізацый на пэўнай тэрыторыі назіраецца іх большая ізаляванасць.

У аналізе сацыяльных сетак існуе падыход, калі ў якасці найбольш устойлівых вылучаюцца канфігурацыі, у якіх узаемныя сувязі маюць 3 і болей актараў (так званыя сімеліанскія сувязі[4]). У такім выпадку можна гаварыць пра стварэнне агульных мэт і каштоўнасцей, рэалізацыю складаных праектаў, больш адчувальную суб'ектнасць.

4 Ад імя немецкага сацыёлага Георга Зімеля, але падчас трансферу праз англійскую мову «зімеліанскія» сувязі пачалі называць «сімеліанскімі». Krackhardt, D. (1999). The ties that torture: Simmelian tie analysis in organizations. SB Andrews, D. Knoke, eds. Networks In and Around Organizations. Research in the Sociology of Organiza tions, Vol. 16.

Гэта звязана з тым, што ва ўзаемаадносінах дзвюх арганізацый кожная можа захоўваць свае ідэі і падыходы, для больш буйных суполак ужо патрэбныя працэдуры і правілы. Сімеліанскія (яшчэ іх называюць трыаднымі) сувязі, акрамя таго, больш устойлівыя ў часе: калі такая сувязь утвараецца, з большай верагоднасцю яна не «распадзецца», таму што нават у канфліктных сітуацыях ёсць «трэці бок». Іншымі словамі, сімеліанскія сувязі — гэта аснова сацыяльнага капіталу ўнутры супольнасці, падмурак для развіцця сталай сумеснай актыўнасці.

На малюнку ніжэй азначаны сімеліанскія сувязі паміж адукацыйнымі арганізацыямі:




**Мал.4.** Мапа сімеліанскіх сувязей асноўнай групы рэспандэнтаў (n=64)

Можна ўбачыць тры суполкі, адна з якіх найбольш шырокая і буйная. Хаця ў цэнтры знаходзіца актар 26, ёсць сувязі паміж іншымі ініцыятывамі. Для далейшага аналізу мы пазначым іх нумарамі:

- Суполка №1: найбольш буйная, з лідарамі 5, 16, 25, 26;
- Суполка №2: сярэдняя па памеры, з «зорнай канфігурацыяй» 8;
- Суполка №3: роўная тройка 18, 33, 34.

Яшчэ можна адзначыць, што сімеліанскія сувязі маюць не ўсе арганізацыі (25 з 64, ці 39%). У той жа час у якасці несумненнага плюса можна азначыць тое, што суполка №1 уяўляе сабой даволі разгорнутую сістэму сувязей. Такая канфігурацыя можа разглядацца як драйвер для далейшага развіцця адукацыйнага ландшафту ўвогуле. Хаця ў цэнтры знаходзяцца 3-4 ініцыятывы, іншыя таксама маюць шырокія сувязі паміж сабой (напрыклад, 21, 44, 59).

***Склад суполак узаемадзеянняў.*** Лагічна паўстае пытанне: хто ўвайшоў у склад суполак з найбольш шчыльнымі сувязямі? Трэба адзначыць, што групы з'яўляюцца даволі рознымі паводле складу ўдзельнікаў, але ўнутры адносна гамагеннымі:

Суполку №1 можна ўмоўна акрэсліць як «старую гвардыю НДА», у цэнтры гэтай канфігурацыі знаходзяцца ініцыятывы, якія складаюць ядро беларускіх недзяржаўных арганізацый, звычайна існуюць не меней за 10 год: прынамсі, лідары — гэта асацыяцыя, рэсурсны цэнтр, асветніцкая арганізацыя. Сярод вузлоў шмат і такіх, што можна аднесці хутчэй да шырокага кола НДА (праваабаронцы, эколагі). На перыферыі ёсць і больш маладыя адукацыйныя арганізацыі.

Суполка №2 уяўляе сабой «маладыя прыватныя арганізацыі». Сярод іх тры прыватныя школы, фонд падтрымкі адукацыйных ініцыятыў, настаўніцкая ініцыятыва. Усе 5 ініцыятыў не старэйшыя за 5 гадоў і ўсе дзейнічаюць хутчэй у межах сярэдняй агульнай адукацыі.

Суполка №3 — гэта «настаўніцкія ініцыятывы». Актар 18 — гэта дзяржаўная арганізацыя, 33 і 34 — незарэгістраваныя нефармальныя настаўніцкія метадычныя ініцыятывы. Цікава, што 18 выкарыстоўваецца хутчэй як інфраструктурная пляцоўка ці hub, дазваляе пераводзіць настаўніцкія ідэі ў больш шырокае і афіцыйна прызнанае поле.

***Масты.*** У сеткавым аналізе ёсць тэрмін «мост» («brigde»)[5] — гэта актар, які звязвае розныя кластэры сеткі. Калі параўнаць малюнкі 2 і 3, то можна пабачыць, што асноўную ролю мастоў адыгрываюць:

- Вузел 5, які з'яуляецца лідарам у суполцы 1 і звязаны з лідарам суполкі 2;
- Вузел 26 (лідар суполкі 1) мае сувязь з 3. У астатнім суполка 2 існуе ізалявана ад больш буйной групы;
- Суполкі 2 і 3 звязаны праз сувязь 8-33, то-бок цэнтральная фігура суполкі 2 можа мець пэўны ўплыў і на суполку 3.
- Суполкі 1 і 3 звязаныя праз сувязі паміж 12 і 18.

З аднаго боку, суполкі не з'яўляюцца цалкам ізаляванымі, бо паміж імі ёсць масты з узаемнымі сувязямі. Усе тры суполкі звязаныя паміж сабой. Аднак гэта 1-2 сувязі, што робіць канфігурацыю менш устойлівай (калі, напрыклад, масты губляюцца). Цікава адзначыць, што усе масты існуюць у тэме сярэдняй адукацыі, навучання настаўнікаў.

5 Marin, A., & Wellman, B. (2011). Social network analysis: An introduction. The SAGE handbook of social network analysis, 11, 25.

## Сувязі інцыятыў

***«Моцныя сувязі» паміж асноўнымі рэспандэнтамі.*** Яшчэ адзін спосаб вылучыць сапраўды значныя сувязі — пакінуць толькі тыя, што грунтуюцца на ўзаемадзеяннях (3,4 і 5 у адказах рэспандэнтаў, гл. метадалогію), а не проста на веданні адзін аднаго.

Адпаведна, так выглядае граф «моцных сувязей», то-бок тая ж сетка ўзаемадзеянняў, на якой пазначаныя толькі сувязі, у якіх ініцыятывы маюць непасрэдны кантакт:




**Мал. 5.** «Моцныя сувязі» асноўных рэспандэнтаў (n=64)

Колькасць узаемадзеянняў значна меншая, чым на малюнку ўсіх сувязей. Можна вызначыць некалькі цэнтраў узаемадзеяння (напрыклад, 4, 5, 8, 12, 16, 21, 25, 45, 49, 53). Гэта арганізацыі, якія не толькі вядомыя іншым удзельнікам, але і маюць уплыў на ініцыятывы. Варта заўважыць, што ўсе рэспандэнты адзначалі хаця б некалькі «моцных сувязей», таму ў параўнанні з малюнкам 1 ніхто не застаўся выключаным з узаемадзеянняў.

Далей можна паглядзець на ўзаемныя і сімеліанскія сувязі па аналогіі з першымі сеткавымі графікамі:




**Мал. 6.** Узаемныя «моцныя сувязі» асноўных рэспандэнтаў (n=64)

Калі ў выпадку фіксацыі ўсіх сувязей на мапе ўзаемных адносін толькі 11 арганізацый засталіся ізаляванымі, то ў гэтым выпадку такіх можна налічыць 19. Узаемныя моцныя сувязі маюць тэндэнцыю да стварэння больш-менш ізаляваных кластэраў. Ёсць адзін вялікі цэнтр узаемадзеянняў і некалькі дробных працоўных груп.

Канфігурацыя на малюнку выглядае больш «няроўнай»: ключавой падаецца роля актара 26, без якой сетка сувязей часткова распадаецца на больш дробныя суполкі. Трэба адзначыць, што на гэтым малюнку іншыя арганізацыі маюць ролю «мастоў» (напрыклад, 3, 51). На агульнай мапе ўзаемадзеянняў яны, хаця і маюць адносна вялікую колькасць сувязей, не належаць да «суперзорак». Іх можна азначыць «інтэгратарамі» сеці ўзаемадзеянняў. Дарэчы, па сутнасці дзейнасці гэта і ёсць арганізацыі, якія маюць форму асацыяцый, саветаў.




**Мал. 7.** Сімеліанскія «моцныя сувязі» асноўных рэспандэнтаў (n=64)

Што датычыцца суполак ініцыятыў, якія б мелі сімеліанскія працоўныя сувязі, то іх вельмі няшмат. Толькі чатыры канфігурацыі адпавядаюць патрабаванням мець менавіта ўзаемныя працоўныя сувязі.

- Суполка #1 (5, 25, 47, 51) — «старыя НДА» (арганізацыі рознага профілю, якія працуюць не менш за 10 гадоў). Яшчэ трэба адзначыць, што ў сеткавым аналізе такая канфігурацыя лічыцца за дзве трыяды (5, 25, 51 і 5, 25, 47). З вялікай доляй верагоднасці розныя трыяды могуць быць аб’яднаны рознай павесткай.

- Суполка #2 (26, 54, 59) — мінска-рэгіянальная супольнасць. Хаця рэгіянальныя арганізацыі маюць тэндэнцыю да ізаляцыі, гэта, наадварот, прыклад актыўнага ўзаемадзеяння дзвюх мясцовых ініцыятыў паміж сабой і з асацыяцыяй у Мінску.

- Суполка #3 (21, 49, 53) — неадукацыйныя арганізацыі, то-бок гэта хутчэй сацыяльныя арганізацыі, якія маюць дадатковую адукацыйную павестку.

- Суполка #4 (3, 7, 8) — прыватныя арганізацыі ў сярэдняй адукацыі (дзве прыватныя школы і фонд)

***«Моцныя сувязі» ўсіх названых ініцыятыў.*** Для параўнання можна паглядзець на ўсе моцныя сувязі, якія былі пазначаны ў межах «поўнай сеткі» ў 256 рэспандэнтаў. Аранжавым колерам пазначаны тыя арганізацыі, у якіх не былі ўзяты інтэрв'ю:




**Мал. 8.** Мапа «моцных сувязей» усіх узгаданых у даследаванні арганізацый (n=256)

Гэтая выява сведчыць, што ў большасці выпадкаў арганізацыі, якія не патрапілі ў даследаванне альбо з'яўляюцца ізалятамі, альбо маюць толькі адну сувязь (т. зн. былі ўзгаданы аднойчы, што можа быць даволі выпадкова). У ізаляты патрапілі 66 ініцыятыў (не ўсе адлюстраваны на малюнку), сярод якіх толькі 2 з тых, што бралі ўдзел у інтэрв'ю.

Тым не менш, можна адзначыць пэўныя арганізацыі, якія знаходзяцца ў цэнтры ўзаемадзеянняў, але не былі апытаны (напрыклад, 131, 139, 166 і інш.). Часцей за ўсё гэта арганізацыі, якія трапілі пад палітычны пераслед і не маглі прыняць удзел у даследаванні, ці больш буйныя (часцей замежныя) арганізацыі, якія ўстрымліваліся ад удзелу.

***Узаемадзеянні па сферах дзейнасці.*** Адным з пытанняў было «Да якой сферы дзейнасці належыць арганізацыя?» Кожны(ая) прадстаўнік(ца) вылучаў(ла) асноўную сферу дзейнасці і мог(магла) пазначыць дадатковыя. У табліцы ніжэй прадстаўлены сферы (пакуль без перакладу) і колер, якім ініцыятывы пазначаны на графе:

| | Колер на мапе | Кірунак дзейнасці | Прыклады форм рэалізацыі |
|---|---|---|---|
| 1 | Чырвоны | Інавацыйныя ці альтэрнатыўныя незалежныя адукацыйныя ініцыятывы, інстытуты, супольнасці | Прыватныя школы<br>Нефармальная (дадатковая) адукацыя |
| | | | Бацькоўскія ініцыятывы (хатняе навучанне)<br>Анлайн-пляцоўкі для навучання<br>Праграмы прафесійнай адукацыі (напрыклад, у супрацоўніцтве з бізнэсам) |
| 2 | Аранжавы | Пляцоўкі для ўзаемадзеяння | Канферэнцыі, абмен досведам, лакальныя ініцыятывы і сеткі, прафесійныя СМІ, пляцоўкі для анлайн-камунікацыі |
| 3 | Жоўты | Павышэнне кваліфікацыі настаўнікаў, выкладчыкаў, кіраўнікоў у адукацыі, даследчыкаў | Анлайн ці афлайн курсы, метадычныя супольнасці |
| 4 | Зялёны | Рэфлексія, аналітыка, даследаванні, распрацоўкі | Даследчыя цэнтры, цэнтры па выпрацоўцы ідэй, канцэптаў, стратэгій |
| 5 | Блакітны | Інфраструктурныя праекты | Фонды, мецэнаты, агрэгатары ініцыятыў, пляцоўкі падтрымкі |
| 6 | Сіні | Іншае | … |



**Мал 9.** Узаемадзеянні па сферах дзейнасці (n=64)

Большая частка ініцыятыў аднесла сябе да раздзелу 1, падрабязная статыстыка прыведзена ў табліцы ніжэй:

| Кірунак дзейнасці | Колькасць арганізацый |
|---|---|
| 1 — Інавацыйныя ці альтэрнатыўныя незалежныя адукацыйныя ініцыятывы, інстытуты, супольнасці | 31 |
| 2 — Пляцоўкі для ўзаемадзеяння | 9 |
| 3 — Павышэнне кваліфікацыі настаўнікаў, выкладчыкаў, кіраўнікоў у адукацыі, даследчыкаў | 11 |
| 4 — Рэфлексія, аналітыка, даследаванні, распрацоўкі | 6 |
| 5 — Інфраструктурныя праекты | 4 |
| 6 — Іншае | 1 |

Аднак варта дадаць, што большасць арганізацый пазначала адразу некалькі сфер дзейнасці і часам розніца паміж асноўнай і дадатковымі была ўмоўнай. Тым не менш, на гэтых графіках арыентацыя ідзе на асноўныя сферы дзейнасці.

Так выглядаюць узаемныя сувязі:




**Мал 10.** Узаемныя сувязі ініцыятыў па сферах дзейнасці (n=64)

Можна ўбачыць, што адукацыйныя ініцыятывы ўзаемадзейнічаюць без строгай прывязкі да пэўнай сферы. Гэта ўласціва і для ўзаемных і сімеліянскіх сувязей.

Калі разглядаць кожную сферу асобна, то можна вызначыць наступныя тэндэнцыі:

- Напрамак 1 (альтэрнатыўныя адукацыйныя незалежныя ініцыятывы — чырвоныя) складае большасць, аднак праз гэта група даволі негамагенная. Да гэтага напрамку сябе аднесілі як пэўныя асацыяцыі, рады, так і прыватныя школы, праваабарончыя і экалагічныя арганізацыі.
- Напрамак 2 (пляцоўкі для ўзаемадзеяння — аранжавыя): лагічна было б чакаць, што такія ініцыятывы мусяць быць сеткавымі лідарамі ўжо паводле роду дзейнасці. Аднак толькі менш за палову з іх выглядаюць даволі значнымі ў сетцы (3, 12, 22, 53), другая частка знаходзіцца хутчэй на перыферыі ці сярод ізалятаў (13, 36, 48, 55, 64).
- Напрамак 3 (павышэнне кваліфікацыі, прафесійная падрыхтоўка ў адукацыі — жоўты): тут сітуацыя паўтараецца, калі некаторыя з арганізацый становяцца лідарамі, а іншыя застаюцца ізаляванымі. 17 і 19 з'яўляюцца дзяржаўнымі арганізацыямі і маюць усё ж даволі абмежаваныя сувязі з недзяржаўнымі ініцыятывамі. Частка арганізацый з малой колькасцю сувязей (напрыклад, 32, 41) — гэта новыя ініцыятывы (2020 года заснавання).
- Напрамак 4 (рэфлексія і аналітыка — зялёны). У гэтым кірунку таксама можна адзначыць, што пераважна такі адукацыйны напрамак маюць толькі 2 ініцыятывы з 6 — пад нумарамі 15 і 30. Астатнія цэнтры распрацоўкі ідэй дзейнічаюць у іншых сферах: права, публічная палітыка, эканоміка і інш. і толькі ўскосна закранаюць тэму адукацыі.
- Напрамак 5 (інфраструктурныя праекты — блакітны) даволі сціпла прадстаўлены на мапе: гэта толькі 4 арганізацыі, і ўсе знаходзяцца на перыферыі сеткавых узаемадзеянняў (маюць максімум 2 узаемныя сувязі). Але на мапе ўсіх сувязей можна ўбачыць, што яны ўсё ж даволі вядомыя сярод іншых прафесіяналаў. Усе чатыры ініцыятывы маюць значную колькасць уваходных сувязей (кожная арганізацыя — не менш за 6). Такая канфігурацыя сведчыць пра тое, што гэта хутчэй пляцоўкі, якія прымаюць на сваёй тэрыторыі пэўныя ініцыятывы, але не заўсёды самі ідуць да іх. Калі разглядзець самі ініцыятывы, якія патрапілі ў гэту катэгорыю, то можна таксама адзначыць, што адукацыйныя праекты — толькі частка іх дзейнасці (хутчэй нават не асноўная).
- Адна арганізацыя пазначыла сваю сферу дзейнасці як «Іншае» (гэта 44).



**Мал 11.** Сімеліанскія сувязі ініцыятыў па сферах дзейнасці (n=64)

Суполка 1 на графе вышэй з найбольш плотнымі сувязямі складаецца з арганізацый рознага кірунку, што робіць яе даволі збалансаванай. Таксама даволі разнастайныя сувязі можна адзначыць і для суполкі 3 (7 і 8 выкарыстоўваюць магчымасці пляцоўкі 1, на якой таксама прадстаўлены кірунак павышэння кваліфікацыі 1).

***Геаграфія ўзаемадзеянняў.*** Большасць арганізацый знаходзіцца ў Мінску. Было некалькі тых, што працуюць толькі анлайн. Статыстыка прадстаўлена ў табліцы ніжэй:

| **Месца знаходжання** | **Колькасць арганізацый** | **Колер на мапе** |
|---|---|---|
| Брэст і вобласць | 2 | Чырвоны |
| Віцебск і вобласць | 1 | Аранжавы |
| Гомель і вобласть | 0 | — |
| Гродна і вобласть | 5 | Зялёны |
| Мінская вобласть | 1 | Блакітны |
| Магілёўская вобласць | 1 | Сіні |
| Мінск | 41 | Фіялетавы |
| Іншае (напрыклад, замежныя, анлайн і афлайн) | 5 | Шэры |
| Некалькі прадстаўніцтваў па Беларусі | 5 | Чорны |
| Толькі анлайн | 5 | Белы |

Акрамя азначэння месца знаходжання, арганізацыі адказвалі на пытанне пра геаграфію сваёй дзейнасці. Напрыклад, арыентуюцца яны пераважна на свой рэгіён ці дзейнічаюць па ўсёй краіне.

| **Геаграфія працы** | **Колькасць арганізацый** |
|---|---|
| Уся Беларусь | 47 |
| Свой рэгіён | 6 |
| Свой раён | 1 |
| Свой горад | 4 |
| Уся Беларусь + міжнародная дзейнасць | 6 |

Што датычыцца міжнароднай дзейнасці, то звычайна гаворка ідзе пра прадстаўніцтва міжнародных арганізацый у Беларусі. Больш рэдкі варыянт — дадатковая знешняя арыентацыя на рускамоўныя краіны.

На малюнку ніжэй прадстаўлена поўная мапа ўзаемадзеянняў у залежнасці ад месцазнаходжання.



**Мал 12.** Узаемадзеянні ініцыятыў па рэгіёнах дзейнасці (n=64)

На выяве можна заўважыць, што ўвесь цэнтр узаемадзеянняў складаецца з вузлоў фіялетавага колеру (геаграфічна — мінскія ініцыятывы), таксама можна заўважыць чорныя квадраты (маюць некалькі філіялаў) і шэрыя (напрыклад, фармальна зарэгістраваныя не ў Беларусі). Усе іншыя колеры (то-бок рэгіянальныя ініцыятывы) знаходзяцца на перыферыі сеткі: можна вызначыць толькі некалькі

даволі блізкіх да цэнтра гарадзенскіх ініцыятываў (зялёныя 54, 59, часткова 19, 24, 57).

На малюнку ніжэй — з выкарыстыннем тых самых колераў — адзначаны ўзаемныя сувязі:




**Мал 13.** Узаемныя сувязі ініцыятыў па рэгіёнах (n=64)

Другі па актыўнасці пасля Мінску рэгіён — Гродна і Гродзенская вобласць (зялёны колер), пры гэтым 3 ініцыятывы з 5 атрымліваюць на гэтай мапе больш цэнтральныя ролі, а дзве становяцца ізаляванымі. Чорным азначаны ініцыятывы, якія маюць прадстаўніцтвы па ўсёй краіне (пры гэтым 3 з іх — заўважныя цэнтры ўзаемадзеянняў, а дзве арганізацыя ізаляваны, што даволі дзіўна для арганізацый з філіяламі). Адзіная магілёўская ініцыятыва, што прымала ўдзел у даследаванні, таксама патрапіла ў спіс ізалятаў. Іншыя рэгіянальныя арганізацыі звычайна маюць 1-2 сувязі з Мінскам (пераважна праз 26).

Ніжэй прадстаўлены сімеліанскія сувязі з геаграфічнымі меткамі. Тэндэнцыя тая ж: трыадныя сувязі часцей маюць сталічныя арганізацыі (часткова і праз тое, што іх больш). Пры гэтым варта звярнуць увагу на суполку 33-34-18, якая існуе пераважна анлайн, але ж мае і фізічную кропку зборкі.




**Мал 14.** Сімеліанскія сувязі ініцыятыў па рэгіёнах (n=64)

Нягледзячы на тое, што можна ўбачыць значную цэнтралізацыю ініцыятыў у Мінску, усё ж такі амаль усе сталічныя ініцыятывы арыентуюцца на ўсю краіну, а не толькі на адзін горад. Хаця пытанне, наколькі такая геаграфічная дыстанцыя не перашкаджае працы, застаецца адкрытым.

## Характарыстыкі сеткі ўзаемадзеянняў

У аналізе сацыяльных ўзаемадзеянняў ёсць некалькі асноўных метрык, якія дазваляюць прааналізаваць асноўныя ўласцівасці сеткі. Напрыклад, цэнтральнасць сеткі, шчыльнасць сувязей, узаемнасць сувязей, дыстанцыі паміж ініцыятывамі. Гэтыя метрыкі дазваляюць ацаніць стан сеткі. Даследаванне адукацыйных ініцыятыў такога тыпу праводзяцца ўпершыню, таму гэта таксама прадстаўляе сабой спробу зафіксаваць становішча «тут і цяпер» (на канец 2020 — пачатак 2021 года), каб пасля можна было ацаніць дынаміку.

***Цэнтральнасць.*** Цэнтралізаваныя сеткі — гэта такія, дзе схема узаемадзянняў кожнага актара максімальна нагадвае сваёй формай зорную канфігурацыю[6] (то-бок пэўныя ініцыятывы збіраюць вакол сябе адносна высокую колькасць сувязей). Напрыклад, на малюнку ніжэй прыведзена сетка з максімальным паказчыкам цэнтральнасці (C=1) — тыповая зорка:




**Мал 15.** «Зорная» мадэль узаемадзеянняў з высокай цэнтральнасцю (n=4)

Сеткавая канфігурацыя, сувязі якой выглядаюць, напрыклад, як ланцужок, характарызуецца меншай цэнтральнасцю. Напрыклад, для сеткі ніжэй гэты паказчык складае 0,33.




**Мал 16.** Мадэль узаемадзеянняў у выглядзе «ланцуга» з невысокай цэнтральнасцю (n=4)

6 У гэтай працы разлічваецца цэнтральнасць па Фрыману, гэта класічная метрыка social network analysis. Freeman, L. C. (1978). Centrality in social networks conceptual clarification. Social networks, 1(3), 215-239.

Калі б у сетцы былі ізаляваныя элементы, то гэта зніжала б паказчык цэнтральнасці. Высокая ступень цэнтральнасці характарызуецца тым, што ў такіх сетках хутка распаўсюджваецца інфармацыя і больш хутка прымаюцца рашэнні.

Важна не блытаць тэрміны цэнтралізацыя і дэцэнтралізацыя, як яны ўспрымаюцца, напрыклад, у палітыцы ці эканоміцы (скажам, дэцэнтралізацыя больш асацыюецца з дэмакратычнымі падыходамі). У сеткавым аналізе высокая ступень цэнтралізацыі ў буйных сетках (калі гэта больш за 30 рэспандэнтаў, а не 4, як на прыкладах вышэй), наадварот, хутчэй сведчыць пра тое, што ў сетцы ёсць вялікая колькасць лідараў.

Ідэальная сетка ўзаемадзеянняў мае высокую шчыльнасць сувязей і даволі высокую цэнтралізацыю, калі амаль кожны актар мае вакол сябе «зорную» канфігурацыю. Такім чынам складаецца сітуацыя, што актары з'яўляюцца роўнымі праз тое, што амаль кожны з іх мае лідарскую функцыю. У гэтым выпадку інфармацыя перадаецца максімальна шпарка, рашэнні прымаюцца хутчэй, а верагоднасць узаемадзеянняў павышаецца.

У сетках з вельмі малой колькасцю сувязей высокая цэнтралізацыя можа сведчыць пра няроўнасць актараў, але гэта даволі рэдкая сітуацыя: у «слабых» сетках сувязі звычайна разрозненыя, адарваныя і рэдка маюцца зорныя канфігурацыі.

**Табліца.** Паказчыкі цэнтральнасці

| Тып сеткі | Паказчык |
|---|---|
| Асноўныя рэспандэнты (n=64), усе сувязі | 0,385 |
| Асноўныя рэспандэнты (n=64), моцныя сувязі | 0,209 |
| Усе ўзгаданыя ініцыятывы (n=256), усе сувязі | 0,195 |
| Усе ўзгаданыя ініцыятывы (n=256), моцныя сувязі | 0,094 |

Паказчык цэнтралізацыі сеткі з 64 асноўных рэспандэнтаў склаў 0,385. Калі пакінуць толькі «моцныя сувязі», то гэты індыкатар зніжаецца да 0,209. Для вялікай сеткі ў 256 актараў гэты паказчык таксама зніжаецца да 0,195 адпаведна, а для сеткі моцных сувязей становіцца вельмі сціплым — 0,094. Гэта падмацоўвае тэзіс, што больш плотныя сеткі з большай колькасцю лідараў маюць больш высокі паказчык цэнтральнасці. Таму адной з мэт у кіраванні можа быць стварэнне такіх умоў, каб вакол кожнай ініцыятывы маглі з'яўляцца «зорныя» канфігурацыі ўзаемных сувязей.

З прычыны таго, што сеткавы аналіз адукацыйных ініцыятыў раней не праводзіўся, амаль немагчыма сказаць, напрыклад, ці 0,385 — гэта добры паказчык альбо дрэнны. Для сетак прафесійных узаемадзянняў (скажам, настаўнікаў ў школе) гэты паказчык можа дасягаць 0,5, але невядома, ці можна гэтую тэндэнцыю перанесці на групу ініцыятыў, якія апрыёры менш звязаныя паміж сабой, чым людзі ў адной арганізацыі. Аднак рост паказчыка моцных сувязей да паказчыка ўсіх можна лічыць адной з метрык у кіраванні.

***Узаемнасць.*** Яшчэ адзін важны параметр аналізу — узаемнасць сувязей. Ідэальная сітуацыя выглядае так, што ўсе адно аднаго ведаюць, то-бок 100% сувязей — узаемныя. Аднак гэта немагчыма, бо, напрыклад, існуюць новыя арганізацыі, якія яшчэ не пабудавалі ўласную сетку ўзаемасувязей. Калі мы кажам пра тып узаемадзеяння 1 («ведаю пра гэту ініцыятыву»), то лагічна, што амаль усе ініцыятывы ведаюць найбольш буйныя, а тыя, са свайго боку, неабавязкова знаёмыя з маленькімі арганізацыямі.

Паказчык узаемнасці для сеткі асноўных рэспандэнтаў — 38,2%. Пры гэтым для сеткі «моцных сувязей» ён няшмат большы — 39,5%. Для вялікай сеткі ўсіх ўзгаданых школ такі паказчык нерэлевантны, бо асноўная колькасць арганізацый не мела магчымасці азначыць сваё кола кантактаў. Першы паказчык даволі нейтральны для аналізу (фіксацыя сітуацыі «тут і цяпер»), аднак цікава, што ўзаемнасць моцных сувязей менш за 40%. У нашым разуменні моцныя сувязі ўжо ўключаюць ідэю ўзаемнасці.

Атрымліваецца, што прыблізна ў 60% выпадкаў адна ініцыятыва пазначае іншую ў якасці партнёра, а прадстаўнік іншай не бачыць такой самай сувязі. З аднаго боку, можа існаваць пэўная хібнасць (рэспандэнт мог забыць пра нейкі праект ці не быў ўключаны ў яго, хаця іншыя чальцы каманды актыўна з ім супрацоўнічаюць). З іншага боку, гэта сведчыць пра тое, што многія сувязі хутчэй слабыя, патэнцыйныя. Напрыклад, тып узаемадзеяння 3 часта азначае ўдзел у агульных мерапрыемствах, аднак гэты ўдзел можа быць даволі пасіўны, а сувязі — ускоснымі.

Гэтая статыстыка таксама падкрэслівае тое, што для аналізу ўзаемадзеянняў лепш выкарыстоўваць графы ўзаемных сувязей (напрыклад, малюнак 6), бо яны даюць больш надзейную інфармацыю пра рэальныя ўзаемадзеянні.

***Шчыльнасць сувязей.*** Яшчэ адна з тыповых характарыстык — шчыльнасць сувязей (density).[7] Гэта прапорцыя існуючых сувязей адносна таго, колькі іх магло б быць усяго (у ідэальнай сітуацыі, калі ўсе ведаюць усіх).

7 Scott, J. (1988). Social network analysis. Sociology, 22(1), 109-127.

Пры павелічэнні памеру сеткі шчыльнасць паніжаецца натуральным чынам, бо, напрыклад, ведаць усіх прасцей, калі сетка на 10 актараў, чым калі яна ўключае 100. Для ўсіх тыпаў сетак статыстыка прадстаўлена ніжэй:

**Табліца.** Паказчыкі шчыльнасці сувязей

| Тып сеткі | Паказчык |
|---|---|
| Асноўныя рэспандэнты (n=64),<br>усе сувязі | 0,113 |
| Асноўныя рэспандэнты (n=64),<br>моцныя сувязі | 0,062 |
| Усе ўзгаданыя ініцыятывы (n=256),<br>усе сувязі | 0,013 |
| Усе ўзгаданыя ініцыятывы (n=256),<br>моцныя сувязі | 0,007 |

Як відаць з табліцы, сетка ўзаемадзеянняў мае шчыльнасць у 11,3% ад максімуму. Сярэдняя колькасць сувязей паміж рэспандэнтамі (усіх тыпаў) складае 7,1, з іх моцных – 3,9. Калі арыентавацца на тыповы псіхалагічны паказчык у 7 (плюс-мінус 2), то можна лічыць, што для паказчыка шчыльнасці моцных сувязей сеткі такога памера  10-15% будзе блізкім для максімальнага параметрам (бягучы — 6,2%). Калі дадаваць у разгляданне і тых, каго ведаюць прадстаўнікі ініцыятыў, то можна высунуць гіпотэзу, што і тут паказчык шчыльнасці можа апынуцца падвоеным.

***Дыстанцыя паміж арганізацыямі.*** Паказчык дыстанцыі[8] дае ўяўленне аб тым, наколькі лёгка адной ініцыятыве звязацца з любой іншай у сетцы. Больш простымі словамі, праз колькі «рукапацісканняў» у сярэднім можна дацягнуцца да любой іншай ініцыятывы.

Пры інтэрпрэтацыі гэтай метрыкі трэба звярнуць увагу, што 1 — гэта паказчык прамой сувязі, а 2 — гэта сувязь праз адно «рукапацісканне». То-бок, каб вызначыць, праз колькі арганізацый звязаныя пэўныя ініцыятывы, можна ад паказчыка звязнасці адняць 1.

**Табліца.** Паказчыкі шчыльнасці сувязей

| Тып сеткі | Паказчык |
|---|---|
| Асноўныя рэспандэнты (n=64),<br>усе сувязі | 2,4 |
| Асноўныя рэспандэнты (n=64),<br>моцныя сувязі | 3,1 |

8 Вылічваецца як сярэдні паказчык сувязей, калі пракладваюцца максімальна кароткія шляхі сувязей паміж усімі вузламі сеткі. Borgatti, S.P., Everett, M.G. and Johnson, J.C. 2013. Analyzing Social Networks. Sage Publications UK.

| | |
|---|---|
| Усе ўзгаданыя ініцыятывы (n=256), усе сувязі | 2,9 |
| Усе ўзгаданыя ініцыятывы (n=256), моцныя сувязі | 3,5 |

Сярод прадстаўнікоў асноўнай сеткі рэспандэнтаў усе знаёмыя з усімі прыблізна праз паўтары рукапацісканні. Калі мы разглядаем моцныя сувязі ці больш буйную сетку ініцыятыў, то гэты паказчык вырастае да 2.

Калі мы маем з кімсьці сувязь праз аднаго чалавека, то знаходжанне гэтай сувязі звычайна (пры жаданні) не патрабуе намаганняў. Сітуацыя, калі паказчык сярэдняй дыстанцыі блізкі да 2, дае магчымасць дацягнуцца да любой ініцыятывы праз аднаго знаёмага. Такая канфігурацыя сеткі ўзаемадзеянняў мае высокі патэнцыял для ўзнікнення новых сувязей і праектаў паміж ініцыятывамі. Прычым пажаданым можна лічыць сцэнарый, калі гэта паказчык сеткі моцных сувязей, таму што, калі мы ні з кім не маем іншых праектаў, больш складана пазнаёміць кагосьці з прадстаўнікамі пэўнай ініцыятывы.

***Лідары сярод ініцыятыў.*** У ТОП-10 па ступені ўключанасці ў узаемадзеянні ўвайшлі вельмі розныя тыпы арганізацый: асацыяцыі, асветніцкія і метадычныя ініцыятывы, пляцоўкі для ўзаемадзеяння і г.д. Пры гэтым большасць вызначыла сваю сферу дзейнасці як 1 (нефармальныя адукацыйныя арганізацыі), вызначаючы аднак некалькі сфер дзейнасці.

Лідарства ў гэтай табліцы вызначалася паводле ўваходных сувязей. Аднак улічвалася не толькі іх колькасць, але і моц. Лідары ранжыруюцца паводле сумы ўваходных сувязей (пазначаны тлустым шрыфтам у слупку 5).

| N | Сыходзячыя сувязі | Уваходныя сувязі | Сыходзячыя сувязі (сума) | **Уваходныя сувязі (сума)** | Сыходзячыя моцныя сувязі | Уваходныя моцныя сувязі | Сярэдняя моц сувязі |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 26 (асацыяцыя) | 27 | 24 | 69 | **77** | 10 | 16 | 3,2 |
| 21 (падтрымка НДА) | 8 | 25 | 23 | **73** | 5 | 16 | 2,9 |
| 5 (асветніцкая арганізацыя) | 20 | 29 | 46 | **70** | 11 | 12 | 2,4 |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 4 (падтрымка школьных ініцыятыў) | 8 | 14 | 27 | **49** | 7 | 11 | 3,5 |
| 12 (пляцоўка для настаўнікаў) | 8 | 18 | 21 | **48** | 4 | 8 | 2,7 |
| 8 (прыватная школа) | 12 | 19 | 35 | **43** | 9 | 5 | 2,3 |
| 2 (фонд) | 5 | 15 | 13 | **41** | 2 | 8 | 2,7 |
| 25 (адукацыйны цэнтр) | 11 | 13 | 32 | **40** | 7 | 7 | 3,1 |
| 51 (асацыяцыя) | 9 | 12 | 31 | **38** | 5 | 7 | 3,2 |

6 з арганізацый-лідараў існуюць 10 гадоў і больш, 4 — адносна новыя (налічваюць 3-5 гадоў з моманту заснавання). Усе 10 знаходзяцца ў Мінску, але вызначаюць геаграфію сваёй дзейнасці як «Уся Беларусь». Усе 10 арганізацый з'яўляюцца недзяржаўнымі, але афіцыйна зарэгістраванымі.

Ёсць арганізацыі, у якіх колькасць уваходных і сыходзячых сувязей даволі блізкая (напрыклад, 25, 26). Аднак мае месца таксама сітуацыя, калі сама ініцыятыва «сціпла» пазначае менш сувязей, чым потым атрымлівае ўваходных.

Прадстаўнікі гэтых ініцыятыў самі адзначалі не менш за 8 арганізацый, з якімі маюць кантакты (хаця б слабыя), што перавышае сярэдні паказчык для сеткі. Гэта значыць, што лідары з большага займаюць праактыўную пазіцыю.

## Патрэбы адукатараў

Былі вызначаны пэўныя патрэбы, якія паўтараліся ў адказах розных рэспандэнтаў. Можна адзначыць, што большасць патрэб трапіла ў некалькі шырокіх груп:

○ ***Больш ініцыятыў цалкам, і ў прыватнасці — ініцыятыў ў рэгіёнах.*** Гэта могуць быць арганізацыі рознага кірунку дзейнасці: цэнтры адукацыі дарослых, пляцоўкі для ўзаемадзеяння, цэнтры павышэння кваліфікацыі, грамадзянскія, асветніцкія ініцыятывы. Больш здаровай канкурэнцыі сярод ініцыятыў у адукацыі. Інстытуцыяналізацыя ініціатыў, магчымасць працаваць у больш шырокім прававым полі.

○ ***Даследаванні ў адукацыі,*** даследчыя цэнтры, надзейныя дадзеныя па Беларусі, thinktanks для адукацыі.

○ ***Альтэрнатыўнае павышэнне кваліфікацыі*** (як для тых, хто працуе ў адукацыі, так і для больш шырокіх колаў), наяўнасць сістэмы (нават канвееру) у павышэнні кваліфікацыі.

○ ***Грамадзянская адукацыя насельніцтва (права, палітыка),*** адукацыя моладзі і дарослых па актуальных у свеце тэмах: напрыклад, глабальнай грамадзянскасці.

○ ***Пляцоўкі для камунікацыі і дыялогу для тых,*** хто працуе ў адукацыі; ініцыятывы, якія былі б фасілітатарамі такога ўзаемадзеяння.

○ ***Заканадаўчыя ініцыятывы і пляцоўкі для абмеркавання праблем адукацыі,*** магчымасць узаемадзеяння гэтых груп з уладай.

○ ***Міждысцыплінарныя ініцыятывы:*** адукацыя + бізнэс і прадпрымальніцтва, экалогія, правы чалавека, гендар, сацыяльныя і эмацыйныя навыкі і г.д.

○ ***Прафесійныя асацыяцыі і прафсаюзы,*** якія б мелі вагу і рэальна прадстаўлялі інтарэсы адукатараў.

○ ***Інфраструктура па падтрымцы ініцыятыў,*** празрыстая грантавая падтрымка, інкубатары ці акселератары адукацыйных ініцыятыў, навучанне адукатараў.

○ ***Больш ініцыятыў у нефармальнай адукацыі, арыентаваных на спецыфічныя групы:*** падлеткі, моладзь, людзі сталага ўзросту, людзі з асаблівасцямі развіцця і г.д.

- ***Больш якасных праграм у дашкольнай, сярэдняй і вышэйшай адукацыі,*** прыватныя альтэрнатывы дзяржаўным садкам, школам і ВНУ.

- ***Культурныя і асветніцкія ініцыятывы,*** асабліва на беларускай мове, анлайн і афлайн.

Цікава адзначыць, што амаль не было запытаў, якія б не патрапілі ў межы азначаных 12 груп.

# ВЫСНОВЫ

**Хаця ініцыятыў даволі мала, большасць з іх мае ўзаемныя праекты з іншымі.** Усе рэспандэнты пазначалі, што маюць працоўныя сувязі з іншымі адукацыйнымі ініцыятывамі і праектамі. Мапа моцных узаемных сувязей, на якой прадстаўлены 45 рэспандэнтаў з 64 (70%) пацвярджае, што гэтыя сувязі сапраўды існуюць, бо адзначаюцца абодвума бакамі. У склад ізалятаў трапляюць перадусім тыя арганізацыі, што займаюцца адукацыйнымі праектамі хутчэй ускосна.

**Устойлівых груп ініцыятыў даволі мала.** Хаця двухбаковых сувязей адносна шмат, ініцыятывы не маюць тэндэнцыі аб'ядноўвацца ў больш буйныя працоўныя групы, дзе кожны ўзаемадзейнічае з кожным. Устойлівых трыяд ва ўсёй сетцы было толькі 5 (аб'яднаныя ў чатыры суполкі). Толькі 13 арганізацый (20%) маюць сімеліянскія (трыядныя) сувязі. Не было ніводнай супольнасці ініцыятыў, у якой сувязі ўсіх з усімі мелі б чатыры ці больш ініцыятывы.

Такім чынам, узаемадзянні існуюць, але ім бракуе каманднасці, аб'яднанасці. Як ужо было адзначана, трыяды і больш буйныя структуры ўзаемных сувязей лічацца падмуркам для фарміравання сацыяльнага капіталу (устойлівай сеткі сувязей, заснаваных на даверы і дасягненні агульных мэт). У эканоміцы сацыяльны капітал сярод насельніцтва наўпрост асацыюецца з павелічэннем магчымасцей эканамічнага росту. У кіраўніцтве адукацыяй (напрыклад, у сярэдняй адукацыі) высокі сацыяльны капітал настаўнікаў звязаны з павышэннем якасці адукацыі. Можна высунуць гіпотэзу, што такія ж тэндэнцыі будуць праўдзівымі і для адукацыйных арганізацый і ініцыятыў. Чым больш высокі сацыяльны капітал уласцівы гэтай сістэме, тым большага росту эфектыўнасці можна чакаць у дзейнасці ўсёй адукацыйнай сістэмы.

**Найбольш развіты кірунак — метадычная падтрымка настаўнікаў.** Гэта можна патлумачыць тым, што мэтавая аўдыторыя даволі шырокая. Да таго ж, частка настаўнікаў мае запыт на веды, узаемадзеянні. Пры тым ускосныя дадзеныя аб азначаных ініцыятывах сведчаць пра тое, што пакуль што гэта даволі невялікая колькасць настаўнікаў (напрыклад, колькасць падпісчыкаў у сацсетках, абвестках звычайна не дасягае 2 тыс. чалавек пры агульнай колькасці настаўнікаў каля 100 тыс.). Іншымі словамі, настаўніцкія ініцыятывы найбольш прыметныя сярод іншых, але і яны ў межах усяго настаўніцкага поля закранаюць не больш 2-3% «настаўнікаў-пасіянарыяў».

**Хаця ёсць разгалінаваная сетка, у кожнай катэгорыі вельмі мала арганізацый.** Пэўныя ініцыятывы адзначалі ў інтэрв'ю: «Нам хацелася б, каб не толькі

мы займаліся гэтым пытаннем, а каб былі і іншыя ініцыятывы ў гэтай сферы». Умоўная «канкурэнцыя ідэй» існуе толькі ў кірунку сярэдняй адукацыі (напрыклад, метадычная падтрымка настаўнікаў), часткова — у асветніцкіх праектах (пераважна ў галіне культуры). Аднак нават гэтыя сферы не заняты цалкам, пра што сведчыць, напрыклад, невысокі ахоп настаўнікаў альтэрнатыўнымі метадычнымі ініцыятывамі (не больш за 3% педагогаў). Таксама распаўсюджаны адказ, што культурніцкіх ініцыятыў усё яшчэ бракуе, як і не хапае асветы ў нішах, дзе намінальна ёсць 1-2 арганізацыі (палітычныя правы, грамадзянскасць, прававая пісьменнасць, роўнасць і г.д.).

**Пэўныя кірункі адукацыі амаль не прадстаўленыя.** На мапе няма ніводнай ініцыятывы, якая б працавала, напрыклад, у галіне дашкольнай адукацыі. Пры гэтым сярод актараў амаль не выказвалася такой праблемы (менавіта пра дашкольную адукацыю). У той жа час міжнародныя даследаванні падкрэсліваюць значную ролю ранняй адукацыі для паспяховасці ў далейшым навучанні. Вельмі сціпла прадстаўлена вышэйшая адукацыя (толькі некалькі студэнцкіх ініцыятыў і аналітычны цэнтр). Часткова гэта можа тлумачыцца асаблівасцямі метадалогіі даследавання, калі не ўсе магчымыя арганізацыі трапляюць на мапу. З іншага боку, гэта можа сведчыць аб ізаляванасці адукатараў, паглыбленасці выключна ў свой кантэкст без бачання шырокай перспектывы, стратэгіі.

**Большасць арганізацый і ініцыятыў канцэнтруюцца ў Мінску.** Абласных ініцыятыў на парадак меней, раённыя можна лічыць выключэннем. Выснова пра тое, што ў абласных і раённых гарадах значна менш ініцыятыў, не новая: пра гэта сведчылі папярэднія даследаванні. Аднак праблемай падаецца тое, што, нягледзячы на невялікую колькасць арганізацый, часта яны  застаюцца ізаляванымі. Можна вызначыць актыўную працоўную групу ініцыятыў у Гродна, аднак астатнім рэгіянальным ініцыятывам уласціва ізаляванасць. Часткова гэта даецца абгрунтаваць тым, што ў пэўнай мясцовасці можа не быць арганізацый з падобнай адукацыйнай павесткай, а сувязі з іншымі рэгіёнамі не наладжаныя. Трэба яшчэ раз адзначыць абмежаванне даследавання з той перспектывы, што ізаляваныя рэгіянальныя ініцыятывы могуць заставацца па-за межамі аналізу.

**Адукатары даволі адзінадушна вызначаюць апісаныя вышэй пункты ў якасці праблем.** З аднаго боку, было шмат адказаў пра тое, што адукацыйных ініцыятыў зараз даволі мала (то-бок гэты ландшафт актараў можа быць больш шчыльны), асабліва па-за межамі сталіцы. З іншага боку, была азначана патрэба ў фасілітацыі ўзаемадзеянняў, пабудове камунікацыі паміж рознымі ініцыятывамі. Важны кірунак — развіццё інфраструктуры для «выгадоўвання» і «адаптацыі» адукацыйных ініцыятыў: ад акселератараў, хабаў, кансультантаў да даследчых цэнтраў і thinktank-аў. Ініцыятывы развіваюцца стыхійна. Вельмі рэдка абумоўліваюць

існаванне адзін аднога. Таму што няма актуальнага прававога поля, запатрабаванасці з боку грамадства, ангажаванасці педагогаў і прадстаўнікоў іншых сфер дзейнасці. Проста кажучы, няма ўсведамлення, што так можна, і гатоўнасці ўзяць на сябе частку адказнасці за адукацыйны ландшафт.

**Першапачаткова неадукацыйныя арганізацыі займаюць значную прастору сярод адукацыйных ініцыятыў.** У склад лідараў на мапе ўзаемадзеяння трапілі шмат арганізацый, для якіх адукацыйная дзейнасць не з'яўляецца асноўнай. Напрыклад, гэта праваабарончыя, экалагічныя, сацыяльна арыентаваныя супольнасці, якія, акрамя асноўнай дзейнасці, ладзяць асветніцкія праекты.

**Структура ўзаемадзеянняў даволі дынамічная.** Хаця падмурак узаемадзеянняў складае суполка НДА, якая існуе не менш за дзесяцігоддзе, новыя арганізацыі могуць даволі часта займаць ролю цэнтральных фігур у сеткавых узаемадзеяннях. Пра гэта сведчыць тое, што ў ТОП-10 уплывовых ініцыятыў чатыры — адносна нядаўнія. Напрыклад, можна заўважыць рост ролі прыватных школ, якія актыўна ўзаемадзейнічаюць паміж сабой і пры гэтым застаюцца ўпісанымі ў метадычную супольнасць арганізацый рознага тыпу.

**Па годзе заснавання можна вылучыць тры хвалі ініцыятыў:** самыя сталыя, якія існуюць з 1990-х (іх не так шмат і гэта звычайна НДА з некалькімі сферамі дзейнасці), яшчэ адна хваля ініцыятыў узнікла ў перыяд адноснай лібералізацыі ў 2011 і крыху пазней (іх можна зазначыць як «аснову»), а таксама новыя ініцыятывы (што маюць менш за 3-5 гадоў). Новыя ініцыятывы паводзяць сябе па-рознаму: адна частка ўліваецца ў агульную супольнасць, другая ўтварае невялікія супольнасці ў сваёй сферы дзейнасці, якія звязаны з агульнай групай ускосна.

**Прадстаўнікі ініцыятыў праяўляюць высокі ўзровень асэнсаванасці праблем у адукацыі:** паводле адказаў было вызначана 12 кірункаў развіцця адукацыйных праектаў. Амаль кожны адказ адзначаўся ў розных формах не менш за тры разы. Высокі запыт можна заўважыць у кірунку адукацыйных даследаванняў, рэфлексіі і аналітыкі. Яшчэ адзін буйны кірунак удасканаленняў — праца над зместам адукацыйных праектаў: больш сучасных, «балючых» для грамадства, арыентаваных на спецыфічныя групы, міждысцыплінарных адукацыйных, асветніцкіх праектаў.